УДК 241.13 + 173.1

Сяргей Аношка

# Новая дактрына Касцёла ці ўдасканальванне каталіцкае Традыцыі? Маральна-тэалагічныя спрэчкі вакол адгартацыі "Amoris laetitia"

**Сергій Аношко**

**Нова доктрина Церкви чи вдосконалення католицької традиції? Морально-теологічні суперечки навколо послання "Amoris laetitia"**

Розглядається опубліковане 2016 року синодальне послання папи римського Франциска "Amoris laetitia" ("Радість любові"), яке викликало гостру дискусію не тільки у середовищі ватиканських богословів, катехитів та моралістів, а й стало предметом дискусій в університетах, в оточенні світських католицьких богословів, на сторінках церковної публіцистики і в богословських книгах. Аналізується текст, присвячений проблемам сімейно-шлюбних відносин та любові. Висвітлюються проблема трактування другого шлюбу і питання допущення осіб, що уневажнили сакральний шлюб, до таїнства св. Євхаристії. З'ясовується трактування змісту "Amoris laetitia" у полеміці між єпископами Польщі, Німеччини, Аргентини, Філіппін, Бельгії і Мальти, які відновили давню суперечку з приводу авторитету римського первосвященика та його ролі і місця в сьогоднішньому християнстві.

*Ключові слова*: "Радість любові", католицька сімейна сексуальна етика, сімейне розлучення, святе Причастя, шлюб, моральна теологія, папа Франциск, синод

**Siarhei Anoshka**

**The new doctrine of the Roman Catholic Church, or the improvement of the Catholic Tradition? Moral and theological disputes over the exhortation "Amoris Laetitia"**

Published in 2016 the post-synodal apostolic exhortation of the Pope Francis "Amoris laetitia" ("The Joy of Love"), which led to the controversial discussions not only among the Vatican theologians, catechists and moralists, but has become a subject of debate at universities, in the circles of secular Catholic theologians, on the pages of church journalism and in theological book , is examined. A text dedicated to the problems of family, marriage relationships and love is analyzed. The problem

of interpretation of the second marriage and the issue of the admission to the Holy Communion sacrament of people, who went through an annulment process of sacred marriage, are highlighted. The interpretation of the content of "Amoris laetitia" in the debate between the bishops of Poland, Germany, Argentina, the Philippines, Belgium and Malta, who revived the long-standing dispute over the authority of the Roman High Priest and his role and place in today's Christianity.

*Keywords:* "The Joy of Love", catholic marital sexual ethics, divorce, the Holy Communion, marriage, moral theology, Pope Francis, synod

19 сакавіка 2016 г. быў афіцыйна прыняты, а 8 красавіка ўбачыў свет тэкст Паслясінадальнай апостальскай адгартацыі Святога Айца Францішка "Радасць любові" (лац. тытул "Amoris laetitia", AL). Гэты дакумент стаў плёнам працы двух апошніх Сінодаў Біскупаў[1] на тэму сям'і, што адбыліся адпаведна 5–19 кастрычніка 2014 г. ды 4–25 кастрычніка 2015 г. *(іл. 1)*. Дакумент AL змяшчае вынікі абмеркаванняў сямейнае тэматыкі, а таксама асвятляе іншыя пытанні з гэтае сферы, вызначаючы напрамкі пастарскае дзейнасці каталіцызму на бліжэйшы час. Нягледзячы на тое, што афіцыйна было абвешчана пра пераемнасць навучання адгартацыі з традыцыяю дактрыны прынятаю ІІ Ватыканскім Саборам ды паслясаборнымі дакументамі на тэму сям'і і шлюбу [1, с. 67], тым не меней "Amoris laetitia" ўзбудзіла вялікія спрэчкі і дыскусіі, што працягваюць трываць й да сённяшняга дня. Дадзеныя дэбаты разгарнуліся не толькі сярод удзельнікаў саміх Сінодаў, але таксама сталі прадметам да абмеркаванняў ва ўніверсітэтах, у асяроддзі свецкіх каталіцкіх багасловаў, на старонках касцёльнае публіцыстыкі і ў тэалагічных кнігах.

[1] Сінод Біскупаў – гэта дарадчы орган пры пантыфіку, створаны Паўлам VI па рэкамендацыі ІІ Ватыканскага Сабора. Склікаецца прыкладна раз на тры гады па ініцыятыве папы для абмеркавання важных пытанняў жыцця Каталіцкага касцёла [2, с. 186]. У 2014 г. адбылася ІІІ Надзвычайная асамблея Сіноду Біскупаў, прысвечаная душпастырскае апецы сем'яў у кантэксце новай евангелізацыі, у 2015 г. прайшла XIV Звычайная асамблея Сіноду Біскупаў на тэму "Пакліканне і місія сям'і ў Касцёле і сучасным свеце".

Відавочна, што дадзеная адгартацыя стала прычынаю не толькі спрэчак, якія не з'яўляюцца анічым дзіўным у традыцыі Каталіцкага касцёла, але, можна нават сказаць, спавадавала сур'ёзны крызіс ва ўлонні Касцёла. Актуальнасць дадзенае тэматыкі перадусім палягае на тым, што спрэчкі вакол зместу ўзгаданага дакументу трываюць нават пасля двух гадоў ад моманту публікацыі, ускрываюцца ўсё больш новыя факты наконт інтэнцый і колаў уплыву, якія б маглі пасрэдна ці наўпрост аказваць уздзеянне на папу Францішка, які падпісаў адгартацыю. "Amoris laetitia" стала прадметам для не толькі тэалагічных дыспутаў маралістаў і катэхетаў, але таксама выклікала паважны крызіс каталіцкае тоеснасці, зноў аджылі даўнія пытанні наконт аўтарытэту рымскага першасвятара і яго ролі ды месцы ў сённяшнім каталіцызме.



*Іл. 1. Прэзентацыя адгартацыі „Amoris laetitia" генеральным сакратаром Сіноду Біскупаў кард. Ларэнца Бальдзісэры на прэс-канферэнцыі, 08.04.2016 (AP Photo/ Nicole Winfield)*

Цалкам невыпадкова вышэйакрэсленая тэматыка ўзбуджае багата зацікаўленасці сярод каталіцкіх, але й не толькі, аўтараў, што прысвяцілі свае працы (выступленні, артыкулы, кнігі і г.д.) гэтае праблеме. У дадзеным тэксце мы засяродзімся на некаторых з тых пазіцый, галоўным чынам польскага, нямецкага і англамоўнага сегменту, бо менавіта там дыскусія стала найбольш заўважнаю, спрычыньваючыся да развіцця меркаванняў і розных думак. Таму ў якасці галоўнае мэты артыкулу можна вызначыць спробу аналізу тэалагічнае рэфлексіі, што паўстала ў касцёльным асяроддзі цягам апошніх двух гадоў (2016–2018), а таксама разважанні на тэму

самое істоты праблемы, прычынаю якой безумоўна стала ўзгаданая папская адгартацыя.

Галоўнаю ідэяю дадзенага тэксту будзе прэзентацыя розных поглядаў у дачыненні да як самога тэксту AL, так й да пытанняў, якія застаюцца найбольш гарачымі ў трываючае дыскусіі. Варта будзе звярнуць увагу на розныя асяродкі думкі сучасных тэолагаў Касцёла, каб паспрабаваць больш глыбока ўсвядоміць важнасць дадзенае праблемы. Якім чынам належыць чытаць тэкст адгартацыі, што хацеў тым сказаць рымскі першасвятар і якія наступствы могуць чакаць Касцёл? Вось тыя дылематы, якім будзе прысвечана ніжэйшае разважанне.

***

Ад 1968 г., калі была абвешчаная энцыкліка Паўла VI "Humanae Vitae", не было аж да нядаўна столькі палемікі і непаразумення вакол папскіх дакументаў. Галоўным спрэчным момантам ва ўсім гэтым пытанні стаў фрагмент адгартацыі, які прысвечаны пытанням асобаў па разводзе, але перабываючых у новых шлюбных несакрамэнтальных саюзах; асабліва пункт 305 у Раздзеле VIII "Спадарожнічаць, распазнаць і інтэграваць тое, што слабое" [3, с. 207–208]. Узгаданыя заўвагі да пункту 305 па-рознаму інтэрпрэтаваныя не толькі праз рэлігійных публіцыстаў, але таксама праз саміх святароў, тэолагаў, біскупаў ці нават кардыналаў з ватыканскіх кангрэгацый. Адрозніваюцца таксама пазіцыі нацыянальных епіскапатаў: калі, напрыклад, польская Канферэнцыя Біскупаў сцвярджае, што дакумент захоўвае пераемнасць і нічога не ўводзіць істотна новага, дык у той самы час зусім іншае меркаванне прэзентуюць епіскапаты Нямеччыны, Аргентыны, Філіпінаў, Бельгіі ці Мальты [4, с. 70]. Прадстаўнікі апошніх упрост кажуць: дысцыпліна сакрамэнтаў змянілася, што дазваляе асобам па разводзе, што жывуць у новых нефармальных саюзах, падыходзіць да св. Камуніі (укр. "приймати святе Причастя").

Варта аднак таксама памятаць, як зазначае прафесар кананічнага права з універсітэту ў Мюнстэры Клаўс Людзіке, што канон 915 Кодэксу Кананічнага Права надаль адназначна трактуе перабыванне ў другім шлюбе як перманентны пералюб, а значыць, стан цяжкага граху [5, с. 242]. Навіна адгартацыі менавіта й палягае на тым, каб паспрабаваць разабрацца ў канкрэтных сітуацыях, не шэрагуючы кожнага выпадку паўторнага шлюбу да аднаго й таго ж чынніку; Францішак выразна пра тое піша ў AL. 298–300, не забываючыся казаць пра важнасць каталіцкае навукі аб непарыўнасці сакрамэнтальнага шлюбу. Не кожны, хто, маўляў, аб'ектыўна жыве ў чарговым шлюбе, ці, паводле каталіцкае дэфініцыі, перабывае ў нерэгулярнае шлюбнае сітуацыі, перабывае ў стане цяжкага граху [6, с. 249].

Дадаючы такое адценне, Францішак, можна сказаць, вырашыў пэўную дылему, што цягнулася ад часу прыняцця яшчэ Янам Паўлам II "Familiaris consortio" (FC): у папярэдняй адгартацыі з 1991 г. таксама падкрэслівалася пэўнае вычуванне разнастайнасці сітуацый, аднак, тым не меней, было даволі катэгарычна сцверджана, што перабыванне ў новым шлюбным саюзе, нават пры аб'ектыўнае сітуацыі адсутнасці віны ў разводзе, не магло быць падставаю да дапушчэння такой асобы да прыняцця Эўхарыстыі. Адзінаю магчымасцю, якую тады дапускаў папа Ян Павел II (пункт 84 FC), было так званае "белае сужэнства" – адсутнасць сэксуальнага жыцця паміж партнёрамі ў другім шлюбе [7, с. 66]. У адпаведнасці з новаўвядзеннем AL Францішак, здаецца, з'яўляецца большым прыхільнікам не спекулятыўна-дэдуктыўнага метаду, але падыходу індуктыўнага, надаючы асабліваю ўвагу канкрэтным дасвядчэнням вернікаў.

Цяжка дыскутаваць з некаторымі ватыканістамі, якія спрабуюць лагодзіць спрэчкі, звяртаючы ўвагу на тое, што так вялікі і разнапланаваны дакумент (й сапраўды, адгартацыя мае 325 пунктаў, аб'яднаных у 9 Раздзелаў) нельга толькі звесці да

дэбаты наконт аднаго пункту, ці нават адной зноскі да гэтага пункту. А разам з тым нельга забывацца таксама й на тое, як часам толькі адно слова было вартае не тое, што выклікаць багаслоўскі дыспут, але нават падзяліць Касцёл – найлепшым прыкладам можа быць знакамітая сітуацыя з Filioque [гл. 8, с. 51; 9, с. 38–44].

Актуальны брак паразумення, што точыцца вакол “Amoris laetitia”, насамрэч сягае значна большых глыбіняў разладу ў Касцёле, бо мае сваё даўняе падложжа рознагалоссяў і нязгоды. Напрыклад, св. Камунія для разведзеных была практыкавана ўжо раней у Касцёле нямецкім. Тады, праўда, старшыня Канферэнцыі епіскапату Нямеччыны кард. Райнхард Маркс любіў паўтараць, што “мы не з’яўляемся філіяй Рыму” [10, с. 190], прапаноўваючы аднак пры падтрымцы кард. Вальтэра Каспера дапускаць да Эўхарыстыі асобы па разводзе, але пад варункам адбытай імі пакуты [11, с. 74–75]. Зараз жа прыхільнікі маральнае лібералізацыі ўпрост атрымалі гатовы дакумент з Ватыкану, на які вольна могуць спасылацца перад абліччам крытыкі асобаў нязгодных.

16 ліпеня 2016 г. каталіцкая арганізацыя з Бразіліі Інстытут Plinio Corrêa de Oliveira апублікавала дэкларацыю пад назваю “Supplica filiale” з выразамі клопату наконт магчымага запланаванага руйнавання сужэнства і сям’і. Дэкларацыя была зваротам-просьбаю да Францішка аб недапушчэнні рэлятывізацыі навучання Езуса Хрыста ў сямейных пытаннях, а адначасова пра магчымасць адклікання дакументу “Amoris laetitia”.

Дадзенае пытанне, як апынулася, не было такім відавочным таксама для некаторых іншых кардыналаў, якія 19 верасня 2016 г. пастанавілі звярнуцца да Францішка з просьбаю аб высвятленні некаторых дыскусійных і незразумелых момантаў адгартацыі. Кардыналы Рэйманд Л. Бёрк, Вальтэр Брандмюлер, Ёахім Майснер (†05.07.2017) і Карла Кафара (†06.09.2017) спрабавалі высветліць сітуацыю, кіруючы да рымскага першасвятара “Dubia”

(лац. “Сумневы”) [12, с. 45]. Сярод пяці скіраваных пытанняў, напрыклад, былі такія:

– ці можна дапускаць да сакрамэнту пакаяння і св. Камуніі разведзеных, якія ўступілі ў новыя несакрамэнтальныя саюзы?

– ці з’яўляюцца маральныя нормы, якія забараняюць унутрана дрэнныя дзеянні (acta intrinsece mala), абсалютнымі і абавязваючымі без усялякіх выключэнняў?

– ці далей актуальна вучэнне, выкладзенае ў энцыкліцы Яна Паўла II “Veritatis splendor”, згодна з якім абставіны або намеры не могуць ператварыць унутрана дрэннае па свайму аб’екту дзеянне ў “суб’ектыўна” добрае? [13]. Адказ з Ватыкану не надыйшоў *(іл. 2)*.

Першыя званочкі непакою былі пачутыя ўвесну 2016 г., калі, спасылаючыся на папскі дакумент, для сваёй дыяцэзіі ў Вене кард. Крыстаф Шонборн распрацаваў адмысловую інструкцыю па ўвядзенні AL у пастырскую практыку тамтэйшага Касцёла. Праз месяц, у траўні, падобны голас пачуўся ад абпа Бруна Фортэ, адказнага ў Касцёле за справы апостальства свецкіх. 5 верасня пантыфік скіраваў ліст да епіскапату Аргентыны, які па сутнасці быў адказам на пытанне тамтэйшых біскупаў[2]. Пасля абвяшчэння тэксту адгартацыі біскупы з Аргентыны вырашылі запытацца ў папы, ці правільна яны разумеюць, што асобы па разводзе і перабываючыя ў новых саюзах могуць прыступіць да св. Камуніі? Біскуп Рыму адказаў: “Тэкст вельмі добры і дакладна аддае раздзел VIII Amoris laetitia” [4, с. 71]. У сваім адказе, адрасаваным біскупу дыяцэзіі Сан Мігель Сэрхіё Альфрэда Фэною, Францішак дзякуе за ўласцівае разуменне, маўляў, аргентынскія біскупы не дазваляюць агулам на прычашчэнне ўсім тым, хто знаходзіцца ў паўторным шлюбе, але толькі пад варункам пастырскае дапамогі і кансультацыі такіх людзей [14, с. 218]. А менавіта гэта на ўвазе й меў пантыфік.

[2] Падобныя просьбы кіравалі ў Ватыкан таксама біскупы з Канады і ЗША, а таксама чацвёра кардыналаў, што цесна супрацоўнічалі яшчэ з Янам Паўлам II, але Францішак адказаў толькі аргентынцам.




*Іл. 2. "У цяжкім становішчы" (карыкатура Remont Cartoon)*

4 кастрычніка 2016 г. з'явілася 17-старонкавая інструкцыя наконт таго, як уводзіць у жыццё AL ужо ў рымскай архідыяцэзіі, то бок там, дзе кіруе сам папа. Чарговы раз падкрэслівалася, што асобы па разводзе і перабываючыя ў новых саюзах па пэўным пастырскім высвятленні сітуацыі могуць прыступаць да Эўхарыстыі. Больш дакладны ў інтэрпрэтацыі быў тэкст ад 8 студзеня 2017 г. двух каталіцкіх іерархаў з Мальты – абп. Шарля Шыклуны ды бп. Марыё Грэха. Дакумент мальтыйскіх біскупаў, які пасля быў таксама апублікаваны на старонках афіцыйнага ватыканскага выдання "L'Osservatore Romano", простым тэкстам казаў, што прыступаць ці не прыступаць да Камуніі залежыць выключна ад іх уласнага сумлення, пры гэтым не мае патрэбы нават кансультавацца з духаўнікам [15, с. 5]. Крыху пазней аўтары з Мальты атрымалі ліст з падзякаю Святога Айца за тое, што напісалі такі дакумент.

Летам 2017 г. адзін з самых блізкіх супрацоўнікаў Францішка рэктар каталіцкага ўніверсітэту UCA ў Буэнас-Айрэс, а адначасова галоўны рэдактар адгартацыі абп Віктар М. Фернандэс падрыхтаваў тэкст, які павінен быў бы абараняць як сам тэкст дакументу пантыфіка, так й ягонага аўтара, то бок папу Францішка. Апалогія "Amoris laetitia" была апублікаваная ў "Medellín" – афіцыйным часопісе Канферэнцыі епіскапату Лацінскае Амерыкі (CELAM), што толькі ўзмацняла пазіцыю дадзенага тэксту. Абп Фернандэс зазначае, што сэрцам "Amoris laetitia" ўсё-ткі з'яўляецца тэма любові, а не праблема Камуніі для разведзеных асобаў у новых саюзах. Акрамя таго, нельга рэдукаваць Бібліі і закрываць дзверы перад тымі, хто жыве ў несакрамэнтальных саюзах; гэта вядзе, піша арцыбіскуп, да смяротнае пасткі. Такім чынам, абп Фернандэс тымі словамі па сутнасці талераваў канкубінат [16, с. 22, 24]. У сваім апалагетычным тэксце абп карыстаецца "тактыкаю экстрэмальнае сітуацыі", падаючы прыклад жанчыны, якая была катавана мужам-алкаголікам, і якая адыйшла ад яго. Аднак, як здаецца, абп Фернандэс забываецца сказаць пра тое, што ў дадзеным выпадку дзейнічае не AL, але ўжо толькі кананічнае права Касцёла. Паводле меркавання журналіста С. Магістра, менавіта абп Фернандэс з'яўляецца аўтарам амбівалентных пунктаў папскае адгартрацыі [17, с. 199].

Кард. Герхард Л. Мюллер, былы прэфект Кангрэгацыі Веравучэння (2012–2017), які быў адкліканы з гэтае пасады Францішкам 1 ліпеня 2017 г., неаднаразова падкрэсліваў, што тэкст папскае адгартацыі не можа быць адчытываны толькі выключна праз Традыцыю Каталіцкага касцёла. Аднаго каментарыя занадта мала, каб казаць, што дактрына Касцёла была зменена. "Нельга жыць адначасова ў стане Божае ласкі, і ў стане граху", – кажа кардынал, адначасова заўважаючы, што, хаця тэкст адгартацыі й вымагае шэрагу сур'ёзных паправак і карэкты, аднак ён не бачыць у дакуменце ерасі *(іл. 3)*.



*ISSN 2523-4234 Ist. relig. v Ukraini: nauk. schorichn., 2018, Vyp. 28, Ch. II.*



*Іл. 3. Кардыналы Герхард Л. Мюллер і Крыстаф Шонборн на Сінодзе Біскупаў, 14.10.2015 (CNS photo/Paul Haring)*

У Ватыкан часцяком прыходзяць анкеты, якія мясцовыя епіскапаты праводзяць на тэрыторыі сваіх дыяцэзій. Хаця надаль там утрымліваецца стабільная прыхільнасць вернікаў да моцных і трывалых сем'яў, аднак усё часцей чуюцца галасы, што Касцёл мае змяніць сваё стаўленне да пытанняў сэксуальнае этыкі, і не толькі дазволіць прычашчацца асобам па разводзе, але кардынальна направіць таксама сваё стаўленне ў дачыненні да гомасексуалістаў і сэксуальнага жыцця перад шлюбам увогуле, а таксама пытанняў кантрацэпцыі і абортаў[3]. Маўляў, вернікі ўжо не разумеюць аргументацыі Касцёла на гэты конт [18, с. 79]. Усё гэта сведчыць пра тое, аб чым ужо даўно пісалі й сацыёлагі рэлігіі, й тэолагі: вера

[3] Паводле інфармацыі ангельскага парталу Catholic Herald, кардынал Р. Маркс з нагоды свайго 10-гадовага юбілею быцця арцыбіскупам Мюнхену і Фрайзінгу на пачатку лютага 2018 г. даў інтэрв'ю, дзе чарговы раз зазначыў пра магчымасць дабраслаўляць так званыя гомасэксуальныя шлюбы ў Каталіцкім касцёле ў Нямеччыне.

і маральнасць заходняе цывілізацыі ўсё часцей бываюць адсунутыя да прыватнага абшару жыцця сучаснага чалавека, змяняюцца, такім чынам, цэлыя катэгорыі антрапалагічнае парадыгмы сучаснасці. Пасля падзей 1968 г. на Захадзе ўсё большая колькасць маладзёнаў пачынае жыць не толькі без шлюбу царкоўнага, але нават не імкнуцца мець шлюб цывільны, ці т.зв. свецкі, пашыраецца практыка "пробных шлюбаў" [1, с. 70–71].

Стратэгія Апостальскага Пасаду на тое, каб перачакаць сітуацыю і не звяртаць аніякае ўвагі на галасы крытыкі, здаецца, не да канца апынулася быць прадуманаю. Чарговай спробай высветліць, што ж усё-ткі папа меў на ўвазе ў сваёй адгартацыі, распачалася ў ліпені 2017 г. Тады 40 каталіцкіх дастойнікаў скіравалі 25-старонкавы ліст на адрас ватыканскага Дому св. Марты, дзе жыве сённяшні намеснік св. Пятра. Пасля таго, як мінуў месяц, а падпісанты не дачакаліся аніякае рэакцыі з боку пантыфіка (пасланне было дастаўленае 11 жніўня), ліст вырашана было апублікаваць, што й адбылося 24 верасня таго ж года. Пад тэкстам "Correctio filialis de haeresibus propagatis" (лац. "Сыноўскае папярэджанне з нагоды шырэння ерасяў") падпісаліся чарговыя асобы з ліку святароў і свецкіх вучоных: колькасць іх павялічылася да 62 асоб[4].

У дадзеным тэксце ўжо ўпрост сцвярджалася, што ў "Amoris laetitia" праз свае словы, учынкі, а таксама з прычыны неабачлівасці і недагляду пантыфік фактычна пакінуў у моцы 7 ерэтыцкіх палажэнняў, якія датычаць шлюбу, маральнага жыцця, прыняцця сакрамэнтаў, садзейнічаючы праз тое распаўсюду ерэтыцкіх думак ва ўсім Каталіцкім касцёле. З тэкстам "Сыноўскага папярэджання..." можна азнаёміцца ў сеціве, дзе ён быў апублікаваны ў некалькіх моўных версіях [19]. Хіба ўпершыню ад доўгае гісторыі Рымскае царквы пад адрасам біскупа Рыма былі скіраваныя так моцныя словы крытыкі, а нават абвінавачванне ў ерасі [20, с. 72]. Пытанне палягае толькі ў іншым: ці тое абвінавачванне пантыфіка

[4] На пачатак 2018 г. лічба дасягнула ўжо 250 падпісантаў.


ISSN 2523-4234 Ist. relig. v Ukraini: nauk. schorichn., 2018, Vyp. 28, Ch. II.

ў ерасі ў дадзенае сітуацыі было найлепшым сродкам з усіх магчымых?

Дадзены ліст-зварот мае тры галоўныя часткі. У першае вернікі, што падпісалі петыцыю да Францішка, тлумачаць, чаму яны маюць не толькі права, але нават абавязак звярнуцца да біскупа Рыма з такім сыноўскім папярэджаннем. Падкрэсліваюць таксама, што іх ліст цалкам не супярэчыць палажэнням ex cathedra I Ватыканскага Сабору аб беспамылковасці папы рымскага ў пытаннях веры і маральнасці [гл. 9, с. 35–38; 21, с. 16–20]. У другой частцы апісваюцца ерасі, якія, паводле падпісантаў, прысутнічаюць у тэксце адгартацыі. Урэшце прыканцы было пададзена тлумачэнне, чаму сённяшняя Каталіцкая царква знаходзіцца ў такой глыбокай крызе. Падаюцца дзве прычыны: мадэрнізм, што быў асуджаны яшчэ св. Піем X, і відавочны ўплыў ідэй Марціна Лютэра на асобу самога Францішка, які занадта ўжо расхвальваў апошнім часам значэнне гэтага айца Рэфармацыі і ягоны ўплыў на жыццё заходняга хрысціянства. Адметна, што зварот таксама ўтрымлівае інтэнцыі лаяльнасці падпісантаў адносна Каталіцкага касцёла, запэўніванні асобы рымскага першасвятара ў іх малітве за яго, а таксама просьба да пантыфіка аб апостальскім дабраслаўленні для аўтараў [22, с. 2].

Хаця ў апошніх радках дадзенага дакументу ўтрымліваецца гарантыя лаяльнасці, напісаны ён усё-ткі ў духу вострае палемікі, што перашкаджае, як здаецца, правядзенню кансэнсуснага дыялогу ў духу спагады і паразумення. Дзяржаўны сакратар Ватыкана кард. П’етра Паралін пераконваў журналістаў, што дадзены дакумент мае быць разгледжаны дзеля ўважлівага дыялогу, але такі дыпламатычны адказ кардынала, маўляў, быў толькі, як здаецца, завуаляванаю просьбаю іерарха да СМІ перастаць чапляцца папы наконт адгартацыі “Amoris laetitia” і спыніцца ў падкідванні чарговых спробаў высвятлення недасказанасцяў, якія нібы ўтрымлівае дакумент [20, с. 72].

Такім чынам, актуальная крытыка тэксту AL, якая ўтрымліваецца ў двух прааналізаваных вышэй дакументах, точыцца сёння на двух ідэйных франтах: тэалагічным (прыкладам тут могуць быць "Dubia" чатырох кардыналаў), а таксама публіцыстычным ("Сыноўскае папярэджанне…"). Такая карусель з рознымі інтэрпрэтацыямі цягнулася даволі доўга, пакуль не выявілася, што ліст, які ў чэрвені біскуп Рыма скіраваў да біскупаў Аргентыны, мае, як апынулася, статус афіцыйнага навучання, то бок гэты тэкст й належыць браць за афіцыйную пазіцыю Апостальскага Пасаду ў справе інтэрпрэтацыі адгартацыі "Amoris laetitia". Сам Францішак зазначае, што не мае і не будзе іншых інтэрпрэтацый, чым тая пададзеная ў лісце біскупаў Аргентыны [23, с. 67].

Узгаданы вышэй ліст Францішка да біскупаў з Лацінскае Амерыкі не стаў чымсьці новым: афіцыйна быў абвешчаны яшчэ ў верасні 2016 г. Праблема ўзнікла напрыканцы 2017 г., калі пантыфік пажадаў апублікаваць тэкст гэтага лісту, што лічыўся перад тым звычайнаю прыватнаю карэспандэнцыяю, у афіцыйным пераліку дакументаў Апостальскага Пасаду – Acta Apostolicae Sedis, A. A. S.[5]. Дзяржсакратар кард. П. Паралін дадаў нататку, паводле якой ліст да біскупаў Аргентыны атрымаў статус аўтэнтычнага касцёльнага Magisterium (лац. "Навучанне"). Цікавым, а нават крыху дзіўным можа быць тое, што гэты ліст быў далучаны да A. A. S. некалькі месяцаў перад тым, як пра тое стала вядома ў снежні 2017 г. То бок, ані папа, ані Дзяржсакратар, ані бюро Апостальскага Пасаду проста не інфармавалі грамадскасць пра тое цягам некалькіх месяцаў.

Восенню ў сеціве распачалася акцыя, скіраваная на падтрымку пазіцыі папы Францішка і абароны яго ад крытыкаў з уласнага каталіцкага падворку. Ініцыятарамі новай кампаніі сталі аўстрыскі тэолаг Пауль М. Цуленэр з Вены і каталіцкі святар

[5] Acta Apostolicae Sedis – афіцыйны друкаваны орган Ватыкана, які на моцы дэкрэту св. Пія X замяніў сабою Acta Sanctae Sedis, што выходзілі ад 1865 г. да 1908 г. У A. A. S. публікуюцца дэкрэты, энцыклікі, намінацыі, а таксама ўсе іншыя катэгорыі афіцыйных ватыканскіх актаў.

з Прагі, тэолаг і філосаф Томаш Галік. Ініцыятыва атрымала назву “Pro Pope Francis” і разгарнулася па ўсім свеце[6]. Аўтары звароту да пантыфіка (пачаткова, у асноўным нямецкамоўныя тэолагі, біскупы і прыёры кляштароў з Аўстрыі, Нямеччыны, Швейцарыі) дзякуюць Францішку за ягоную смеласць і пастырскае служэнне. Прыхільнікі Яго Святасці падкрэсліваюць мужнасць папы, з якою ён падыходзіць да так далікатных спраў. У якасці адметнае рысы пантыфікату Францішка ініцыятары кампаніі называюць прыхільнасць міласэрнасці, а не літарам канонаў [24]. Дадзеная кампанія стала па сутнасці адказам на “Сыноўскае папярэджанне…”, апублікаванае ў верасні.

Напрыканцы 2017 г. – пачатку 2018 г. распачалася чарговая фаза крызісу. З розных краін пачалі надыходзіць галасы прадстаўнікоў нацыянальных епіскапатаў, якія прагнулі атрымаць ад Францішка дакладны адказ наконт незразумелых і цмяных месцаў у AL. Сярод каталіцкіх іерархаў знайшліся біскупы з Казахстану, ЗША, Італіі, Латвіі, Аўстрыі. Чарговая хваля была выкліканая апублікаваннем у апошні дзень 2017 г. сведчання трох каталіцкіх дастойнікаў з Казахстану: мітрапаліта Астаны абп. Томаша Пэты, абп.-сеньёра Караганды Яна Паўла Ленгі ды бп.-суфрагана Астаны Афанасія Шнайдэра[7]. У сваім звароце біскупы заклікаюць рымскага першасвятара захаваць каталіцкую навуку адносна шлюбу, сцвярджаючы, што кожнае новаўвядзенне ў гэтай сферы парушае Традыцыю каталіцкае і апостальскае веры [25].

Прыхільнікі Францішка аспрэчваюць такое бачанне. Маўляў,

---

[6] На пачатак лютага 2018 г. на афіцыйнае старонцы кампаніі ў сеціве, што месціцца па адрасе https://www.pro-pope-francis.com, было ўжо больш 70 тысяч подпісаў у падтрымку дадзенае ініцыятывы. Цікава, што старонка мае таксама ўкраінскамоўную версію.

[7] Бп. А. Шнайдэр звяртаўся да папы яшчэ ў 2016 г. Тады ў сваім лісце ад 26 траўня казахстанскі іерарх казаў, што распаўсюджванне варожых навук на тэму сужэнства і сям’і можа прывесці да баналізацыі і прафанацыі адразу трох сакрамэнтаў адначасова – сужэнства, пакуты і Эўхарыстыі [17, с. 85].

безумоўна, калі за Традыцыю Касцёла прыняць толькі й выключна метады неасхаластыкі, якія былі распаўсюджаныя ў каталіцызме ад XIX стагоддзя, тады так, тое можна лічыць зрываннем Традыцыі. Аднак нельга забывацца на тое, што Каталіцкі касцёл мае значна больш багатую гісторыю, і рэдукцыя толькі да акрэсленых момантаў і магчымасцяў тэалагічнае інтэрпрэтацыі не выдаецца быць слушнаю.

Наваўвядзенні AL, паводле думкі Францішка, дазволяць людзям больш вольна пачуваць сябе ў другім шлюбе, асабліва, калі першае сужэнства было цалкам знішчана і ўжо не з'яўляецца сапраўдным шлюбам ані ў сумленні саміх тых асобаў, ані ў звычайнае людскае ацэнцы грамадства. Калі першы шлюб застаецца выключна прававой фікцыяй, нельга казаць, што абсалютна ўсе асобы ў другім сваім шлюбным саюзе жывуць у стане цяжкага граху [14, с. 227]. Бачым, што пантыфік больш схільны ісці ў кірунку адмовы ад маральных асуджэнняў. Логіка выключэння, паводле Францішка, не павінна болей займаць дамінуючае пазіцыі ў каталіцкае тэалогіі.

Спрабуючы адказаць на пастаўленае на пачатку тэксту пытанне пра зрыванне Традыцыі, варта памятаць, што адказ не мае быць адназначны. Безумоўна, не будзе нечым новым, калі скажам, што адбыліся пэўныя змены. З іншага боку даволі цяжка тых змен шукаць непасрэдна ў тэксце, што выйшаў з-пад пюра Францішка. Дыскусіі, дэбаты і спрэчкі прысутнічаюць, аднак усё гэта точыцца не на старонках вышэйаналізаванага дакументу, але толькі ў медыйнай прасторы каталіцкіх і свецкіх СМІ, на безлічы круглых сталоў і падчас выкладаў у семінарыях і на ўніверсітэтах [26, с. 41]. Сам факт адсутнасці канкрэтыкі ў тэксце папскай адгартацыі, пра што кажуць нават прыхільнікі AL, стаў прычынаю да хаатычнага абмеркавання пасылу, які хаваецца ў тэксце, кажуць адны, альбо, як кажуць іншыя, які насамрэч нічога не змяняе, а толькі працягвае шматвяковую Традыцыю Касцёла ў галіне маральнасці і сэксуальнае этыкі [26, с. 46]. Можна сустрэцца таксама й з трэцім пунктам

гледжання, паводле думкі прыхільнікаў якога, папа Францішак, будучы пад уплывам дзвюх плыняў у Касцёле – ліберальнай і кансерватыўнай, – наўмысна пакінуў пэўную нявызначанасць у тэксце AL, каб у выніку атрымаўся кампраміс [27, с. 191].

У любым выпадку, падсумоўваючы, неабходна адзначыць, што нягледзячы на дыскусіі, якія надаль трываюць і яшчэ будуць працягвацца вакол знакамітага ўжо сярод тэолагаў пункту 305 AL і зноскі 351 да яго, ужо сёння, хіба, не прадстаўляецца няправільным адзначыць, што Пасінадальная адгартацыя “Amoris laetitia” стала сапраўдным зваротным пунктам у маралістыцы Касцёла пачатку XXI стагоддзя. Асоба чалавека пачынае быць разгляданая, а, прынамсі, такую інтэнцыю тут можна ўбачыць, у якасці суб’екту маральнасці, якую Касцёл мае ўвест час заахвочваць ды падтрымліваць на духу [28, с. 90]. Чалавек таксама становіцца больш суб’ектам самога Касцёла, а не ягоным аб’ектам. AL дазволіла ўвайсці ў іншы этап развіцця дактрыны, калі пэўны прыклад больш ужо не з’яўляецца вызначэннем і абгрунтаваннем маральных пастулатаў. Пры ацэнцы Францішак на першае месца ставіць каханне, што, зрэштаю, й адлюстравана ў назве адгартацыі: папа імкнецца навучыць вернікаў практычным навыкам выкарыстання нормаў маралі ў духу любові. Таксама варта памятаць й пра тое, што ў сваёй практыцы багата тэолагаў-маралістаў нават пасля апублікавання дакументу Францішка надаль кіруюцца прынятымі маральнымі схемамі ды нормамі, асабліва што тычыцца сферы прыняцця Эўхарыстыі парамі, якія знаходзяцца ў так званай нерэгулярнай шлюбнай сітуацыі [29, с. 128]. Novum Францішка палягае на тым, каб самому індывідуальна застасаваць дадзеныя нормы і схемы да канкрэтнае жыццёвае сітуацыі – датычыць тое як святароў, так і сужэнствы. Гэта прыём, які ў тэалагічнае літаратуры атрымаў назву “педагогікі заахвочвання” [30, с. 311].

Цікавым, і нечаканым для некаторых, можа быць таксама экуменічнае гучанне AL. Як падкрэсліваецца, падсумоўваючы ў сваім тэксце працу двух апошніх Сінодаў, папа Францішак



*ISSN 2523-4234 Історія релігій в Україні: наук. щорічн., 2018, Вип. 28, Ч. II.*

не толькі заклікае да эластычнасці і гнуткасці ў некаторых маральных праблемах св. Камуніі, але таксама дае тым самым свой выраз удзячнасці прынцыпу саборнасці, маўляў, усё тое было выпрацавана пры дапамозе выразнае эклезіялагічнае методыкі працы [31, с. 144]. Можа варта тут узгадаць й праваслаўную сакрамэнтальную практыку, дзе, як вядома, паўторны шлюб пад пэўнымі варункамі ёсць мажлівы, хаця тое й не з'яўляецца больш ліберальным падыходам, як часам нам можа здавацца [гл. 32, с. 139–145].

Апублікаваная вясною 2016 г. адгартацыя "Amoris laetitia" працягвае выклікаць дужа спрэчак у асноўным па прычыне таго, што папа Францішак паспрабаваў змяніць прыярытэты ў сферы маральнага багаслоўя сучаснага каталіцызму: міласэрнасць павінна заўсёды выходзіць на першае месца. Як бачна, не ўсе з аптымізмам і даверам аднесліся да аналізаванага тут тэксту, асабліва зважаючы на акалічнасці, якія атачалі прыняццё адгартацыі і наступныя дэбаты на яе тэму. Больш таго, некаторыя крытыкі глыбока перакананыя, што тэкст адгартацыі стаў прычынаю вялікае нявызначанасці наконт практыкі прымянення некаторых з пунктаў. Замест таго, каб дакладна акрэсліць абсяг дзейнасці і варункі, у якіх варта стасаваць тыя новыя правілы, AL часам звычайна пакідае пэўныя, даволі істотныя рэчы на сумленні тых, хто сам у тым мае быць зацікаўлены [33, с. 48; 34, с. 105].

Напісаная жывою моваю адгаратцыя істотным чынам адрозніваецца ад папярэднях папскіх дакументаў у багатавяковае гісторыі Рымскае царквы. Звяртаючыся да вернікаў Касцёла па ўсім свеце, Францішак прагнуў змусіць іх да ўласнае рэфлексіі, даць ім надзею, каб мець магчымасць змяніць сваё жыццё [35, с. 7].

Толькі некалькі аспектаў, што былі абмеркаваныя ў дадзеным тэксце, паказваюць, на колькі цяжкаю ў рэцэпцыі з'яўляецца адгартацыя Францішка. Чытач дакументу пры жаданні заставацца верным Традыцыі Касцёла і духу самога біскупа Рыма мае чытаць AL у духу ўсяго датыхчасовага Magisterium



*ISSN 2523-4234 Ist. relig. v Ukraini: nauk. schorichn., 2018, Vyp. 28, Ch. II.*

Ecclesiae. Дэбаты і спрэчкі былі выкліканыя галоўным чынам несцісласцю фармулёўкі з Раздзелу VIII, але ж рэшта дакументу застаецца вытрыманаю менавіта ў пастырскім стылі сённяшняга намесніка св. Пятра. Дзеля таго, каб не атрымалася, што навучанне пярэчыць самому сабе, неабходна ўважліва і кемліва падыходзіць да інтэрпрэтацыі ўсяго зместу адгартацыі, пазбягаючы вырывання акрэсленых сказаў і зносак з агульнага змесціва. У адваротным выпадку існуе вельмі небяспечная тэндэнцыя пратэстантызацыі каталіцызму, калі даведзены да скрайнасці аўтанамізм інтэрпрэтацыйны, адсутнасць аўтарытэту навучання і адарванне ад герменеўтычнае традыцыі могуць завесці ў памылковым кірунку, а Касцёл можа паўтарыць тыя невыбачныя памылкі – асабліва, што тычацца спраў маральнасці і этыкі сужэнства, – якія калісьці зрабілі пратэстанты, і заганны плён якіх мы бачым сёння. На гэтыя памылкі Каталіцкі касцёл сёння проста не мае права.

1. Dyduch J. Posłannictwo rodziny w Kościele i świecie w świetle XIV Synodu Biskupów // Polonia Sacra. 2017. R. 21, № 1 (46). S. 67–81.

2. Domfeh-Boateng J. The Catholic Church: Easy Answers to Frequently Asked Questions. Bloomington: Xlibris, 2014. 196 p.

3. Паслясінадальная апостальская адгартацыя Amoris laetitia Святога Айца Францішка / пер. на белар. мову. Мінск: Про Хрысто, 2016. 232 с.

4. Górny G. Katolicyzm na rozdrożu. Papieski dokument w centrum największej kontrowersji teologicznej XXI w. // Sieci prawdy. 2017. 11–17 września (№ 37). S. 70–72.

5. Lüdicke K. Amoris laetitia – spojrzenie kanonisty // Warszawskie Studia Pastoralne. 2017. R. XII, № 1. S. 241–246.

6. Luño A. R. Amoris laetitia: wskazania dla duszpasterskiego rozeznania // Warszawskie Studia Pastoralne. 2017. R. XII, № 1. S. 247–251.

7. Biały S. Troska Kościoła polskiego o małżeństwa rozwiedzione po opublikowaniu adhortacji apostolskiej Amoris laetitia. Aspekt Komunii świętej // Studia Teologiczne. 2017. № 35. S. 61–75.

8. Siecenski A. E. The Filioque: History of a Doctrinal Controversy. Oxford; New York: University Press, 2010. 355 p.

9. Табак Ю. Православ’я і католицтво: Основні догматичні та обрядові розбіжності (Короткі нариси). Львів: Видавництво Українського Католицького Університету, 2007. 66 с.

10. Rowiński T., Chrzanowski P. Książka w Watykanie zakazana? // Christianitas. 2015. № 59. S. 189–196.

11. Wenz W. Pozycja kanoniczna wiernych żyjących w związkach niesakramentalnych: na kanwie dyskusji i propozycji w zakresie nowych możliwości kanoniczno-pastoralnych w codziennej praktyce życia // Studia Salvatoriana Polonica. 2014. № 8. S. 65–88.

12. Kuljovsky B. The Law of Gradualness or the Gradualness of Law? A Critical Analysis of Amoris Laetitia. A Point of No Return?: Amoris Laetitia on Marriage, Divorce and Remarriage / ed. Th. Knieps-Port le Roi. Munster: Lit Verlag, 2017. P. 45–64.

13. Ватыканскае радыё. Кардынал-прэфект: не будзе карэкцыі “Amoris laetitia”. Ватыканскае радыё. Святы Пасад \ Каментарыі, 10.01.2017. URL: http://be.radiovaticana.va/news/2017/01/10/кардынал-прэфект_не_будзе_карэкцыі_“amoris_laetitia”/1284691 (Last accessed: 07.02.2018).

14. Schockenhoff E. Zerwanie z tradycją czy konieczność uzupełnienia wiedzy? Dwa sposoby odczytania adhortacji apostolskiej Amoris laetitia // Warszawskie Studia Pastoralne. 2017. R. XII, № 4. S. 217–231.

15. Archdiocese of Malta and the Diocese of Gozo, Criteria for the Application of Chapter VIII of Amoris Lætitia, January 2017.

16. Fitzgibbons R. The Cost of Passive-Aggressive Anger from the Vatican and the Hierarchy. The Latin Mass: the Journal of Catholic Culture and Tradition. 2017. P. 22–25.

17. Rowland T. Catholic Theology. London; Oxford; New York; New Delhi; Sydney: Bloomsbury, 2017. 256 p.

18. Skrzypczak R. Okaleczone relacje a duch miłosierdzia. Trudna recepcja adhortacji “Amoris laetitia” papieża Franciszka // Warszawskie Studia Teologiczne. 2016. R. XXIX, № 4. S. 76–110.

19. Correctio Filialis de haeresibus propagatis. URL: http://www.correctiofilialis.org/ (Last accessed: 05.02.2018).

20. Terlikowski T. P. Synowskie upomnienie o herezje // Do Rzeczy. Tygodnik Lisickiego. 2017. 9–15 października. (№ 41). S. 72.

21. Joy J. P. Cathedra Veritatis: On the Extension of Papal Infallibility. Howell: Cruachan Hill Press, 2012. 158 p.

22. Filial [Letter of] Correction of Pope Francis For the Propagation of Heresies // Catholic Truth. Keeping the Faith, Telling the Truth – a bi-monthly newsletter for informed Catholics. 2017. № 103. P. 1–2.

23. Kratiuk K. Utajnione przyspieszenie // Do Rzeczy. Tygodnik Lisieckiego. 2017. 11–17 grudnia. (№ 50). S. 66–67.

24. Müller A. "Pro pope Francis" – Solidarität mit Papst Franziskus Internationale Initiative zur Unterstützung des pastoralen Kurses von Papst Franziskus. Franziskaner, 24.10.2017. URL: https://franziskaner.net/pro-pope-francis/ (Last accessed: 06.02.2018).

25. Tornielli A. Three Kazakh bishops, "The application of Amoris laetitia spreads divorce". La Stampa, Vatican Insider, 06.01.2018. URL: http://www.lastampa.it/2018/01/06/vaticaninsider/eng/the-vatican/three-kazakh-bishops-the-application-of-amoris-laetitia-spreads-divorce-UoGR6ILanykooWOiOpAMTJ/pagina.html (Last accessed: 06.02.2018).

26. Grad P. Unieszkodliwianie Magisterium. Studium dyskusji o Amoris Laetitia, 305 // Christianitas. 2016. № 65. S. 41–84.

27. Massaro Th. Mercy in Action: The Social Teachings of Pope Francis. Lanham: Rowman & Littlefield, 2018. 222 p.

28. Goertz St., Witting C. Wendepunkt für die Moraltheologie? Kontext, Rezeption und Hermeneutik von Amoris laetitia. Amoris laetitia – Wendepunkt für die Moraltheologie? Freiburg; Basel; Wien: Verlag Herder GmbH, 2016. S. 9–94.

29. Sikorski J. Towards a Conjugal Spirituality: Karol Wojtyla's Vision of Marriage Before, During and After Vatican II // Journal of Moral Theology. 2017. Vol. 6, № 2. P. 103–129.

30. Karaś A. Niezmienność nauczania Kościoła na temat moralności aktu małżeńskiego według adhortacji Amoris laetitia papieża Franciszka // Studia Redemptorystowskie. 2016. № 14. S. 295–313.

31. Hill Ch. Hope Versus Optimism: The Hidden Rocks in Anglican Roman Catholic Dialogue. Hope in the Ecumenical Future / ed. M. D. Chapman. Oxford: Palgrave McMillan, 2017. P. 133–145.

32. Kobeczko Ł. "Amoris laetitia" w perspektywie prawosławnej. Więź. 2016. R. 59, № 4. S. 139–145.

33. Mescher M. Families in Crisis and the Need for Mercy // Journal of Moral Theology. 2018. Vol. 7, № 1. P. 28–69.

34. Tykfer M. Duszpasterstwo nawrócone, czyli pedagogika Franciszka // Więź. 2016. R. 59, № 4. S. 101–108.

35. Rubio J. H. Reading, Praying, Living Pope Francis's The Joy of Love: A Faith Formation Guide. Collegeville: Liturgical Press, 2017. 96 p.